НЕЗАЛЕЖНАЯ ГАЗЕТА ШУМІЛІНШЧЫНЫ

# СЬВІТАНАК

*Беларусь,
твой народ
дачакаецца
Залацістага,
яснага дня!
М. Багдановіч.*

**№ 11 (123), ВЕРАСЕНЬ 2011 ГОДА**

**http://haradok.belarda.org - сайт нашага рэгіёна**

**ПОГЛЯД РЭДАКТАРА**

## ЦІ ПЕРААДОЛЕЮЦЬ УЛАДЫ ЭКАНАМІЧНЫ КРЫЗІС?

**Кіраўніцтва краіны неаднаразова заяўляла, што эканамічнага крызісу на Беларусі няма, а ёсць толькі "часовыя цяжкасці". Аднак негатыўныя з'явы ў эканоміцы працягваюць нарастаць, як снежны камяк. Дэвальвацыя, інфляцыя, шалёны рост цэнаў, дэфіцыт валюты і беларускіх грашовых знакаў – наступствы супярэчлівай грашовай палітыкі ўладаў пагаршаюць і без таго нізкі ўзровень жыцця насельніцтва.**

Урад Аляксандра Лукашэнкі зараз знаходзіцца ў стане глыбокай разгубленасці. Не здолелі нават як след правесці ўжо сумна вядомую дэвальвацыю. Так, дэвальвацыя беларускага рубля вясной бягучага года выклікала інфляцыю, крызіс крэдытных адносін, рэзкае сніжэнне рэальных даходаў насельніцтва. А што яшчэ іншага можна было чакаць пры зніжэнні курса рубля ажно на 56 працэнтаў?

Зараз на Беларусі найбольш шматлікую групу складаюць работнікі, у якіх памер налічаных заробкаў складае каля трохсот долараў па афіцыйнаму курсу або менш за 250 долараў па аднаму з рынкаў. Да гэтага прывяло менавіта штучнае павышэнне заработнай платы адміністрацыйным шляхам па краіне падчас прэзідэнцкай кампаніі 2010 года. Напярэдадні зімы мінулага года былі павялічаны не толькі заробкі работнікам, але і памеры пенсій і іншых выплат. Такое напампаванне эканомікі нічым не забяспечанай грашовай масай стымулявала інфляцыю, якая ад пачатку года вырасла да 36, 2 працэнтаў, і яе рост не спыняецца і сёння. Па росце інфляцыі Беларусь ужо абагнала ўсе краіны СНД у разы, а па сярэдняй заработнай плаце адстае ад Малдавіі – самай бяднейшай краіны Усходняй Еўропы (250 долараў у Беларусі супраць 256 долараў у Малдавіі).

Доўгі час лукашэнкава начальства хвалілася сваім паспяховым "рыначным сацыялізмам". У рэшце рэшт гэта мадэль не вытрымала папуліцкай нагрузкі перад выбарамі. Пусты папяровы рубель абясцэніўся, а цэны імкліва рванулі ўверх – прадаўцы ў магазінах не спраўляюцца перапісваць цэннікі. Лукашэнка, які спачатку абяцаў іх спыніць, вярнуць страчаную "стабільнасць", цяпер загаварыў пра лібералізацыю. А "лібералізацыя" найперш палягае ў тым, што яго урад і новыя кіраўнікі Нацбанка баяцца вырашаць большменш сур'ёзныя пытанні. Як вядома, Лукашэнка сам сабе і урад, і галоўны банкір, і парламент, і галоўнакамандуючы. Чыноўнікі самастойна рашэнні прымаць не могуць – паралізавана воля, а Нацбанк увогуле ніколі не меў самастойнасці.

Замест рашучых дзеянняў па ўмацаванні беларускага рубля быў зноў запушчаны механізм эмісіі папяровых грошай. Работнікі цяпер атрымліваюць мільённыя заробкі, за якія можна набраць прадуктаў у магазіне на тыдзень. Ці не наспеў час пазбаўляцца ад паперак-фанцікаў шляхам дэнамінацыі, або неабходна ўвесці новыя грошы, якія стануць сапраўднай нацыянальнай валютай? Напрыклад , у суседняй Латвіі сваю валюту паважаюць – латышскі лат каштуе два долары, а наш рубель за адзін долар па афіцыйнаму курсу пераваліў ужо за пяцітысячную мяжу.

Наогул, дзейнасць грашовай палітыкі з боку ўрада і Нацбанка настолькі супярэчлівая, што яе немагчыма зразумець. Напрыклад, дырэктыўным шляхам увялі гэтак званы "множественный курс доллара". Пры гэтым афіцыйны курс наблізіўся да рыначнага, "альтэрнатыўныя" курсы ў камерцыйных і іншых дзяржаўных банках адпусцілі. Валюта ў абменніках з'явілася, але для насельніцтва сітуацыя стала зноў нявыгадная: здаць валюту зараз танна, а купіць дорага. Урад разлічваў на тое, што на руках насельніцтва прыблізна ад 15 да 20 мільярдаў долараў і людзі панясуць валюту ў дзяржбанкі. Але ж не панеслі – больш не давяраюць.

Фінансавыя аналітыкі сцвярджаюць, што без вонкавых крэдытаў краіна з крызісу не выйдзе. Беларусь штогод выдаткоўвае на 15 працэнтаў болей, чым вырабляе, і ўсё гэта краіна бярэ ў крэдыт. МВФ і Еўрасаюз крэдытаў не дадуць, пакуль не будуць выпушчаны з турмаў палітычныя зняволеныя і былыя кандыдаты ў прэзідэнты. Суседняя Расея выдзеліць пазыкі толькі тады, калі алігархічным кланам дазволяць прыватызаваць беларускую дзяржмаёмасць, у тым ліку і нацыянальныя багацці. Але гэта – страта незалежнасці. Прычым сам Аляксандр Лукашэнка і яго атачэнне таксама разумеюць, што могуць страціць рэальную ўладу.

Як жа спыніць разбурэнне беларускай эканомікі? Пакуль што ясна адно – патрэбен надзейны замежны інвестар. Кіраўнікі Беларусі даўно прызвычаіліся да таго, што крэдытаванне застаецца адзінай крыніцай фінансавання беларускай эканомікі. Паводле міжнародных экспертаў, патрэбы Беларусі ў экстранным фінансаванні – да 6 мільярдаў долараў да канца году. Але хто ахоча супрацоўнічаць з узурпатарам і яго бюракратычным рэжымам, калі большую частку замежных крэдытаў ён гадамі выкарыстоўваў на стратныя папуліцкія праграмы ды ўмацаванне свайго іміджу?

Па ўсяму відаць, што магчымасць атрымаць замежныя крэдыты становіцца ўсё менш рэальнай. Пры гэтым не трэба забываць, што ніякі вонкавы інвестар не дапаможа, пакуль не запрацуе ўнутраны. А гэта азначае, што эканамічны крызіс на Беларусі будзе ўсё больш паглыбляцца. Калі ж фінансавы крызіс перарасце ў эканамічны спад, то пятля крызісу будзе зацягвацца і гэтыя крызіс з эканамічнага непазбежна перарасце яшчэ і ў палітычны.

**Аляксандр Шчамлёў.**

**САМАЗАБЕСПЯЧЭННЕ**

## З лішкамі прадукцыі– на кірмаш

Сёлетняй восенню ў Віцебску праводзіцца спецыяльны кірмаш, на якім будуць гандляваць установы адукацыі з усёй вобласці. У кастрычніку туды будзе адпраўлена машына і з Шумілінскага аддзела адукацыі. Сельскія школы раёна гатовы падзяліцца з насельніцтвам лішкамі гародніны, вырашчанымі на прышкольных участках.

Кожная сельская школа нашага раёна мае свой участак, ёсць яны і ў некаторых дзіцячых садках. Магчыма не ўсе ведаюць, што школы падпарадкоўваюцца не толькі навучальнаму плану. Райаддзелам адукацыі даводзіцца яшчэ і гэтак званы план нарыхтовак, згодна з якім школам трэба вырасціць і назапасіць неабходную колькасць гародніны. Насамрэч нічога незвычайнага ў гэтым няма – сельскія школы заўсёды займаліся агародніцтвам і садаводствам. Вырошчвалі бульбу, моркву, капусту, цыбулю, буракі. Цэлае лета школьнікі і настаўнікі з дапамогай бацькоў рупяцца на прышкольным участку. Такім чынам агароднінай забяспечваецца школьная сталовая, што несумненна ўплывае на пparticular харчавання. Пры гэтым арганізавана другасная занятасць для вучняў, яны маюць магчымасць крыху падзарабіць у вольны час канікул.

Разам з тым дзяржава выдзяляе датацыю на харчаванне дзяцей, у выніку чаго бацькам за паўнацэннае абед даводзіцца плаціць некалькі тысяч рублёў у месяц. Аднак уласныя патрэбы на поўніцу забяспечылі толькі Обальская і Навікоўская школы. Астатнім завозяць прадукты цэнтралізавана з райспажыўтаварыства. Перад дзіцячымі садкамі задачу самазабеспячэння гароднінай паставілі нядаўна. Надоечы першымі пачалі вырошчваць прадукцыю ў Кардонскім, Мішневіцкім і Светласельскім дзіцячых садах.Некаторыя наладзілі прамыя сувязі з вытворцамі прадукцыі. Да прыкладу, Мішкавіцкі дзіцячы сад супрацоўнічае з сялянска-фермерскай гаспадаркай "Крыніца". Работнікі садка працавалі у гаспадарцы, каб зарабіць сабе і дзецям на бульбу.

Зараз нарыхтоўка гародніны на зіму ідзе поўным ходам. Ураджай сёлета добры, лішкі прадукцыі можна прадаць і гараджанам. На кірмаш павязуць кабачкі, гарбузы, фасолю, буракі, капусту, бульбу. Выручаныя грошы ад продажу гародніны дазволяць папоўніць пазабюджэтныя рахункі і скараціць бюджэтныя выдаткі.

**Алесь Шумскі.**

**ПРЫМУСОВАЯ ПРАЦА**

## СТУДЭНТЫ НА ПАЛЯВЫХ РАБОТАХ

**Кожны год на палетках шумілінскіх калгасаў працуюць студэнты з навучальных устаноў Віцебска. Сёлета ў наш раён "на бульбу"прыслалі 115 навучэнцаў.**

У калгасе "Прыдзвінскі" падбіраюць бульбу хлопцы – першакурснікі Віцебскага дзяржаўнага прафесійна-тэхнічнага ліцэя. 50 ліцэістаў павінны за верасень выкапаць 28 гектараў бульбы, а выкапанае перабраць. Надвор'е стаіць добрае, таму хлопцы ў асноўным завіхаюцца на полі. За дзень можна падабраць 80-100 вёдзер, расцэнкі прымальныя. Стымул для працы ёсць – за месяц абяцалі па 300-400 тысяч рублёў. За такую цяжкую працу гэты зусім сімвалічныя грошы, аднак нейкая надбаўка да мізэрнай стыпендыі не пашкодзіць.

Жывуць студэнты ў будынку былога швейнага цэха, частка расселена па прыватных кватэрах калгаснікаў. За харчаванне з хлопцаў вылічваюць па пятнаццаць рублёў у дзень.

Прыкладна на такіх умовах працуюць 40 навучэнцаў з Віцебскага індустрыяльна-педагагічнага каледжа ў "Райаграсервісе". Яшчэ 25 студэнтаў-першакурснікаў дапамагаюць убіраць бульбу ў саўгасе "Мішневічы".

Разам з тым не зусім зразумела, навошта бульбу ў раёне ўбіраюць уручную. Між іншым, нашы чыноўнікі неаднаразова казалі, што маўляў, з бульбай цяпер спраўляюцца бульбаўборачныя камбайны, а студэнты будуць заняты ў асноўным на ўборцы гародніны, карняплодаў і лёну. Куды ж падзелася тэхніка, якую дзяржава давала сельгаспрадпрыемствам нашага раёна?

Дарэчы, даволі трывалая практыка 50-х гадоў уцягвання студэнтаў на Беларусі ў "бітву за ўраджай" засталася і дагэтуль. Як бы там ні было, але яна мае і іншы негатыўны аспект: дэзарганізуецца вучэбны працэс. Студэнты не займаюцца цэлы месяц да кастрычніка, пасля чаго трэба "даганяць" распрацаваную вучэбную праграму, што не можа не адбіцца на якасці падрыхтоўкі будучых спецыялістаў.

Многія маладыя людзі, нягледзячы на прымусова-добраахвотны парадак сельгасработ з ахвотай едуць у калгасы на "бульбу". Аднак не ўсе з іх ведаюць, што падтрыманне такой савецкай "традыцыі" з'яўляецца грубым парушэннем як заканадаўства краіны,так і нормаў міжнароднага права. 41 артыкул Канстытуцыі абвяшчае: "Прымусовая праца забараняецца, акрамя работы або службы, якая вызначаецца прыгаворам суду ў адпаведнасці з законам або надзвычайным і ваенным становішчы". Паводле артыкулу 1 Канвенцыі ААН аб скасаванні прымусовай працы, Беларусь як краіна – сябра міжнароднай Арганізацыі працы абавязаная скасаваць прымусовую працу і не прымяняць яе, сярод іншага, "у якасці метаду мабілізацыі працоўнай сілы для патрэб эканамічнага развіцця". Прымус навучэнцаў для сельгасработаў таксама супярэчыць артыкулу 8 Міжнароднага пакту аб грамадзянскіх і палітычных правох і артыкулу 5 Канвенцыі ААН аб рабстве.

З усяго відаць, што чыноўнікі аблвыканкаму ў сваёй дзейнасці кіруюцца не законамі, а уласнымі паняццямі і асабістай выгадай.

**Алесь Шумскі.**

**"СВІТАНАК" У ІНТЭРНЭЦЕ**

**Наша газета стала размяшчаецца на партале *http://kamunikat.org/*, дзе зацікаўленыя грамадзяне могуць яе спампаваць са старонкі: *http://kamunikat.org/svitanak.html*, што у каталагу "Пэрыёдыка" для далейшага выкарыстання яшчэ да з'яўлення газеты на паперы.**

## АБ'ЯВА

- ***Каб атрымліваць кожны нумар газеты «Світанак» паведаміце рэдакцыі аб гэтым – зробіце бесплатную падпіску. Калі не жадаеце атрымліваць газету, то таксама патэлефануйце.***
- ***Рэдакцыя «Світанка» змяшчае бясплатныя абвесткі чытачоў выдання. Дзеля размяшчэння абвесткі патэлефануйце ў рэдакцыю.***
- ***Калі парушаны вашы правы спажыўца, працаўніка, то даем эфектыўныя парады па абароне права і пошуку бясплатных юрыстаў. Звяртайцеся на адрас газеты «Світанка».***
- ***Рэдакцыя запрашае да супрацоўніцтва неабыякавых грамадзян. Вашы навіны, паведамленні – нашая падзяка. Словам, сувенірам.***

## НАША ЭКАЛОГІЯ

# Аднаўленне выпрацаванага тарфянішча ў Обалі

**Каля гарадскога пасёлка Обаль здадзены ў эксплуатацыю гідрасістэмы, збудаваныя на тэрыторыі выпрацаванага тарфянога радовішча. Для другаснага забалочвання обальскага тарфяніка неабходна было ўзняць ваду на ўсёй тэрыторыі да ўзроўню глебы. Менавіта для гэтага зрабілі каскаднае перакрыццё асноўных каналаў трыццаццю землянымі і каменнымі перамычкамі.**

Гэта тэрыторыя стала другім завершаным аб'ектам у Віцебскай вобласці ў рамках сумесных мерапрыемстваў праекта з Праграмай развіцця ААН і Глабальным экалагічным фондам (ГЭФ) "Рэнатуралізацыя і устойліваe кіраванне тарфянымі балотамі дзеля перадухілення дэградацыі зямляў, зменаў клімату, забяспячэнню захавання глабальна значнай біялагічнай разнастайнасці".

Першыя практычныя вынікі ўзнаўлення гідралагічнага рэжыму обальскіх тарфянікаў былі прадстаўлены падчас прыёму здадзенага аб'екта. У склад дэлегацыі, якая праводзіла агляд збудаванняў, уваходзілі прадстаўнікі Міністэрства лясной і воднай гаспадаркі. У наш раён прыбылі і высокія госці, прадстаўнікі ААН/ПРААН на чале са спадаром Антоніусам Брукам.

Варта адзначыць, што збудаваны аб'ект на обальскіх балотах абыйшоўся ў 47,5 тысяч долараў. Як вядома, верхавое Обальскае балота займае плошчу больш як за дзве з паловай тысячы гектараў. Пасля таго, як тут перасталі здабываць торф, узвышаныя месцы пачалі зарастаць хмызняком, а на паніжаных пачаўся працэс забалочвання. Выпрацаваны тарфянік Обаль, а гэта каля 750 гектараў, – адзін з найбольш пажаранебяспечных аб'ектаў на Віцебшчыне. Працяглыя і моцныя пажары тут ужо былі ў 1997, 1998 і 2002 гадах.

Увогуле, тарфяныя балоты ва ўсім свеце з'яўляюцца адным з самых важных тыпаў натуральных біятопаў. У Беларусі ёсць значная колькасць тарфяных балотаў і іншых тыпаў водна-балотных абшараў.

У Беларусі каля 400 тысяч асушаных тарфянікаў, якія сталі малапрыгоднымі для сельскагаспадарчага выкарыстання. Асушванне і наступная распрацоўка тарфяных радовішчаў парушае гідралагічны рэжым не толькі на саміх радовішчах, але і на прылеглых тэрыторыях. Акрамя таго, знішчаюцца месцапражыванні водна-балотнай флоры і фаўны, уключаючы рэдкія і знікаючыя віды, занесеных у Чырвоную Кнігу Беларусі.

У Шумілінскім лясгасе балоты займаюць каля дваццаці працэнтаў тэрыторыі. А гэта азначае, што на сённяшні дзень пастаўлена задача аднавіць гідралагічны рэжым і вакол самога райцэнтра. Прынамсі, наш рэгіён стане больш прывабны для аматарскага рыбалоўства, будзе больш магчымасцяў для арганізацыі экалагічнага турызму.

Чаму міжнародныя арганізацыі гатовы ўкладаць новыя сродкі ў нашы балоты? На думку навукоўцаў нашай краіны, такая сусветная цікаўнасць да беларускага досведу па ўзнаўленні, захаванні і ўстойлівым выкарыстанні дэградаваных тарфяных глеб невыпадковая. Бо мерапрыемствы па аднаўленню выпрацаваных тарфянішчаў дазволяць знізіць мінералізацыю торфу, вылучэнню ў атмасферу дыяксіду вугляроду, звесці да мінімуму магчымасць узнікнення пажараў, а таксама скарацiць выкіды ў паветра парніковых газаў.

**Алесь Прыбярэжны.**

## ТЭРЫТОРЫЯ ДАБРА

# ПРАЗ 66 ГАДОЎ ЗНАЙШЛІ МАГІЛУ ЗАГІНУЎШАГА АФІЦЭРА

**І праз шэсць дзесяцігоддзяў родзічы загінуўшых у вайне едуць да нас шукаць сваіх бацькоў і дзядоў. Нядаўна яшчэ адна сям'я з Ленінградскай вобласці наведала Шумілiншчыну, якая стала апошнім прытулкам для роднага чалавека.**

З 1943 года родзічы спадзяваліся адшукаць прапаўшага без вестак лейтэнанта Серафіма Іванавіча Добранькага. Яго жонка, Надзея Міхайлаўна яшчэ ў 90-х гадах атрымала ліст з Міністэрства Абароны СССР, што камандзір узвода стралковай дывізіі лейтэнант С. Добранькі загінуў і пахаваны ў вёсцы Забар'е Гарадоцкага раёна. Аднак калі родныя савецкага афіцэра прыехалі ў Гарадок, то ў спісах воінаў, загінуўшых у гэтым раёне, Серафіма Іванавіча яны не знайшлі.

Пошукі працягваліся. Неўзабаве высветлілася, што вёска з такой назвай ёсць і ў нашым раёне. У 1943 годзе тут ішлі баі, а загінуўшых салдат, у тым ліку і лейтэнанта Серафіма Добранькага пахавалі на брацкіх могілках у вёсцы Дабея.

З Ленінградскай вобласці ў Дабею прыехалі малодшая дачка афіцэра Ніна Серафімаўна, унук Андрэй Юр'евіч і праўнучка Паліна, а таксама родзічы, якія жывуць на Гомельшчыне. І вось хвалюючы момант – імя воіна адшукалі на памятнай таблічцы брацкай магілы. Суправаджалі родных лейтэнанта старшыня Дабейскага сельсавета Ірына Шалахава, старшыня раённага савета ветэранаў Кацярына Палоўнікава, намеснік старшыні калгаса "Прыазёрны" Ніна Юхнавец. Прысутнічалі на брацкіх могілках і мясцовыя жыхары вёскі Дабея. Ніна Серафімаўна распавяла, што бацька загінуў у 32 гады, пакінуўшы дома трох дачок. Больш як паўстагоддзя лейтэнант лічыўся прапаўшым без вестак. Увесь гэты час не ведалі родныя, што знайшоў ён вечны спакой у межах вёскі Дабея. Шмат гадоў сям'я вяла пошукі, перш, чым з'явілася магчымасць прывезці кветкі на магілу роднага чалавека. Госці з Ленінградскай вобласці вельмі ўдзячны шумілінцам за тое, што зберагаюць памяць савецкіх воінаў, даглядаюць магілы.

Помнікі, абеліскі, магілы воінаў і партызан Вялікай Айчыннай вайны. Колькі іх раскідана па шумілінскай зямлі? І ўсе яны звязаны з трагедыяй, трагедыяй асабістай і трагедыяй многіх народаў, цэлых краін. У той жа час – гэта незабыўныя знакі мужнасці, гераізму і адданасці абаронцаў нашай Айчыны.

**С. Горкі.**

## ЖЫВІ ЯК ГАСПАДАР

# ЗАМЕНА ЗНОШАНАЙ ЦЕПЛАТРАСЫ

**Работнікі жыллёва-камунальнай службы раёна стараюцца міжацяпляльны перыяд выкарыстаць у поўным аб'ёме для правядзення рамонтных работ. Зараз на вуліцах райцэнтра ў адпаведнасці з распрацаванымі планамі ідзе замена зношаных цеплавых сетак.**

Вось вось пачнецца чарговы ацяпляльны сезон, таму падрыхтоўка жылых дамоў да халадоў займае ў работнікаў камунгаса першае месца. На многіх вуліцах Шуміліна, старыя трубы, па якім жыхарам паступалі гарачая вада і цяпло, маральна і фізічна зношаны.

На сённяшні дзень работы вядуцца на ўчастку ад будынка пошты па вуліцы Луначарскага да дома № 2 па вуліцы Шумілінскай. Ужо заменена 350 метраў старых труб на прадізаляваныя. Такія больш сучасныя трубы будуць служыць без страт цяпла на працягу 50 год. Адначасова вядзецца рамонт цеплатрасы на вуліцы Ленінскай і ў раёне вуліцы 70 год БССР. Тут таксама памянялі 160 метраў старых труб.

Інтэнсіўныя работы праводзяць дзве брыгады з 14 чалавек. Апроч замены зношаных цепласетак, брыгады работнікаў жыллёва-камунальнай гаспадаркі праводзяць шмат іншых работ па тэхабслугоўванні жылога фонду. Ім даведзены заданні па мадэрнізацыі ацяпляльных кацельняў, прамыўцы сістэмы ацяплення шматкватэрных дамоў, цеплаізаляцыі надземных труб. Рамантуюць цеплаізаляцыю па вуліцах Юбілейнай, Шумілінскай, Піянерскай, Луначарскага, Кароткіна. Матэрыялаў пакуль хапае, работы вядуцца за кошт сродкаў камунгаса. Напрыклад, прамыўка сістэмы аднаго трохпавярховага дома каштуе 6,5 мільёнаў рублёў. Згодна графіка цеплапровад прамываецца адзін раз у чатыры гады.

Не будзе лішнім нагадаць, што падрыхтоўка да ацяпляльнага перыяду – справа агульная.

Але на жаль, не ўсе жыхары беражліва адносяцца да грамадскай маёмасці. Па прычыне псавання шкленне вокнаў у пад'ездах, замену ізаляцыі труб у падвальных памяшканнях некаторых шматкватэрных дамоў даводзіцца праводзіць па некалькі разоў на год.

Знаходзяцца і такія "майстры", што самі перарабляюць схему сістэмы ацяплення. У прыватнасці, былі выяўлены незаконныя "урэзкі" у сістэму цеплазабяспячэння. Відавочна, што крадзяжы цепланасіцеля – недапушчальная з'ява, і работнікі камунальнага прадпрыемства актыўна працуюць па выяўленню такіх фактаў. Тым больш, што самавольныя ўрэзкі ў сістэму ацяплення вядуць да яе разрэгуліроўкі, да збояў у падачы цяпла і гарачай вады.

Жыхары дамоў таксама не павінны спаць у шапку. Лепш самім своечасова паклапаціцца аб уцяпленні вокнаў, дзвярэй, балконаў, пад'ездаў і падвалаў. Пры гэтым асаблівую ўвагу работнікі ЖКГ просяць удзяліць навядзенню парадку ў падвальных памяшканнях. Ёсць нямала фактаў загрувашчвання падвалаў шматпавярховых дамоў рэчамі гаспадароў. Некаторыя шумілінцы самавольна будуюць там цэлыя сховішчы для агародніны і кансерваваных прадуктаў. Па гэтай прычыне работнікам камунальнай службы іншы раз вельмі няпроста падступіцца да цеплавых вузлоў, водаканалізацыйнага абсталявання, у тым ліку ў час аварыйных сітуацый. А гэта немалыя сродкі, у тым ліку і нашы – усіх жыхароў раёна.

**Я. Вайтовіч.**

## КУЛЬТУРНАЯ ПАДЗЕЯ

# Спорт—альтэрнатыва кепскім звычкам

**Напрыканцы жніўня ў Шумілінскім парку на танцавальнай пляцоўцы праходзіла моладзевая акцыя, скіраваная на прапаганду здаровага ладу жыцця.**

Удзельнікі мерапрыемства заклікалі моладзь пазбаўляцца ад шкодных звычак, весці здаровы лад жыцця, займацца фізкультурай і спортам.

У якасці арганізатараў выступілі настаўнікі СШ №1, кіраўнікі моладзевых арганізацый. Вопыт правядзення падобных акцый ужо мае месца ў нашым раёне. Так, першы крок адмовы ад тытуню можна было зрабіць, памяняўшы цыгарэтку на цукерку. Падчас мерапрыемства адбываліся спартыўныя спаборніцтвы па гіраваму спорту і армрэслінгу. У выніку ўсе пераможцы атрымалі сувеніры.

Юнае пакаленне Шумілінскага краю не толькі стараецца прымлівацца здаровага ладу жыцця, але і вучыць гэтаму іншых. Школьнікі ўдзельнічалі ў конкурсе плакатаў, які праводзіўся па намінацыі "Не шкодным звычкам". Усе юныя агітатары за здароўе атрымалі падарункі.

Увогуле, вучні шумілінскіх школ амаль з першых класаў прывучаны да таго, што мерапрыемствы па гэтай тэматыцы ўжо сталі традыцыйнымі. Неаднаразова праходзілі класныя і інфармацыйныя часы, вучні выказвалі свае думкі, пісалі сачыненні на тэму "Здаровы лад жыцця". Некаторыя меркаванні заслужваюць асаблівай увагі. Як у школах прывіваюць здаровы лад жыцця і змагаюцца са шкоднымі звычкамі можна пабачыць на відэароліках і мультымедыйных прэзентацыях, падрыхтаваных вучнямі. Традыцыйнымі сталі Дні здароўя, акцыі для падрастаючага пакалення "Мы за здаровы лад жыцця", "Моладзь супраць СНІДу", "Мы супраць наркотыкаў".

На заканчэнне мерапрыемства выступіў обальскі рок-гурт "Акно". У канцэртнай праграме прагучалі кампазіцыі "Мы слухаем рок", "Аблокі" і іншыя творы музыкаў аматарскай групы.

Весці здаровы лад жыцця – гэта значыць мець мець унутры моцны стрыжань, і ён не дазволіць асобе адхіліцца ў бок кепскіх звычак, якія сустракаюцца паўсюдна ў нашым жыцці.

**С. Горкі.**

## НАШ ГАНДАЛЬ



# БЛІЖЭЙ ДА ПАКУПНІКА

Днямі на гандлёвай карце нашага райцэнтра з'явіўся новы магазін райпа. Тут пастараліся наблізіць тавар як мага бліжэй да пакупніка – магазін размешчаны амаль каля самай трасы Віцебск-Полацк па вуліцы Юбілейнай.

Той, хто паспеў наведаць новы прадуктовы магазін райспажыўтаварыства, быў прыемна здзіўлены яго прасторнай гандлёвай залай, сучасным халадзільным абсталяваннем. Праўда, асартымент тавараў пакуль што небагаты: кансервы з гародніны, за вітрынай гарбузы, вінаград і бананы, два-тры сарты каўбасы і сыру, малочныя і кандытарскія вырабы. Мяса зусім няма: ні свініны,ні ялавічыны. Толькі гарэлкі і віна ўдосталь. Але гэта толькі на пэўны час. У далейшым будзе завезена прадукцыя, якая карыстаецца попытам у шумілінцаў: разнастайныя кандытарска-кулінарныя вырабы, больш шырокі асартымент мясных прадуктаў. Іншымі словамі, наведаўшыся сюды, пакупнік зможа прыдбаць сабе ўсё неабходнае для стала.

На будаўніцтва новай гандлёвай кропкі раённы бюджэт выдаткаваў 800 мільёнаў рублёў. На цырымоніі адкрыцця магазіна прысутнічалі госці: старшыні Белкаапсаюза і Віцебскага аблспажыўсаюза С. Сідзько і А. Шынкарэнка, першы намеснік старшыні Шумілінскага райвыканкама В. Родзіч. Кіраўнікі дзяржгандлю выказалі спадзяванні, што магазін хутка акупіцца – месца бойкае, на перакрыжаванні дарог, побач – жылыя дамы. Не забыліся каля магазіна зрабіць стаянку для аўтамабіляў.

Несумненна, увесь калектыў кіраўніцтва і прадаўцоў будзе старацца, каб была большая насычанасць магазіна таварамі для паўнейшага задавальнення патрэб і запытаў пакупнікоў.

**Я. Вайтовіч.**

## КРЫМІНАЛ

# ПРЫХАПІЎ ТЭЛЕФОН

У Шумілінскі РАУС звярнуўся рабочы 1983 года нараджэння с заявай аб тым, што пасля сыходу выпадковага знаёмага з яго кватэры прапаў мабільны тэлефон "Нокія". Супрацоўнікамі міліцыі ўстаноўлена, што тэлефон скраў непрацуючы, раней судзімы за крадзёж мясцовы жыхар 1985 года нараджэння. Узбуджана крымінальная справа па арт. 205 ч. 2 КК.

# АБРАБАВАЎ ЛЕЦІШЧА

У міліцыю звярнуўся жыхар горада Віцебска: невядомы злодзей выставіў аконнае шкло і залез у дачны домік. Былі скрадзены: радыёпрыёмнік, электрадрэль, электраразак на суму каля мільёна рублёў. Як высветлілася, злачынства здзейсніў жыхар вёскі Грабніца. Частка маёмасці вернута гаспадару. На вяскоўца заведзена крымінальная справа.

# ПЕРАДАВЫЯ ТЭХНАЛОГІІ

*Абноўленая матэрыяльна-тэхнічная база, сучасныя тэхналогіі, намаганні працаўнікоў на нядаўна збудаваным жывёлагадоўчым комплексе "Баравінка" далі свой плён. На сённяшні дзень гэта адна з лепшых фермаў у раёне.*

Пасля таго, як у вёсцы Башні здалі першую чаргу комплекса для малочных кароў з навейшымі тэхналогіямі атрымання прадукцыі, паказчыкі надояў у ААТ "Аграбаравінка" выраслі амаль у паўтары разы. Цяпер на комплексе дояць 15 літраў малака на карову. Да таго ж забяспечылі занятасць людзей на вёсцы – усё менш вяскоўцаў шукаюць працу ў райцэнтры. І гэта яшчэ не ўсё. Распачалося будаўніцтва другой чаргі на 400 галоў. Актыўныя работы вядуцца з траўня. На будаўніцтва другога перыяду патрабуецца 37 мільярдаў рублёў. Аднак узніклі перашкоды: не хапае цэменту, з-за дажджоў размыты пад'езды да будаўнічай пляцоўкі і г. д. Вызначаны тэрмін здачы аб'екта – да канца кастрычніка. Аб'ект узводзяць спецыялісты будаўнічага прадпрыемства "СаюзІнвестБуд".

**Уладзімір Амбросаў.**

СУДОВЫ ПРАЦЭС

# ЧАМУ Я НЕ ВЕРУ Ў АФІЦЫЙНУЮ ВЕРСІЮ ПАДЗЕЙ 11 КРАСАВІКА

ДЗЯРЖАЎНЫЯ І НАБЛІЖАНЫЯ ДА ЎЛАДАЎ СМІ РОБЯЦЬ УСЁ МАГЧЫМАЕ, КАБ ГЭТАЕ НЯВЕР'Е ТОЛЬКІ ЎМАЦОЎВАЛАСЯ. НАВЕШВАННЕ ЯРЛЫКОЎ, НЕДАГАВОРКІ, МАНІПУЛЯЦЫЯ ФАКТАМІ, А ТО І НЕПРЫХАВАНАЯ ХЛУСНЯ — АФІЦЫЙНАЯ ПРЭСА, НАБЛІЖАНЫЯ ДА ЎЛАДАЎ ІНФАРМАГЕНЦТВЫ І ШТАТНЫЯ ПРАПАГАНДЫСТЫ РОБЯЦЬ УСЁ МАГЧЫМАЕ, КАБ ПАСЕЯЦЬ НЕДАВЕР ДА АФІЦЫЙНАЙ ЖА ВЕРСІІ ПРЫЧЫН ТРАГЕДЫІ Ў МІНСКІМ МЕТРО. ПРЫКЛАДАЎ ШМАТ, ТАМУ СПЫНЮСЯ НА САМЫХ СВЕЖЫХ.

**«Мы жылі ў мірнай, спакойнай, радаснай краіне»**

На пяты дзень суда па справе тэрактаў дзяржаўнае агенцтва БелТА змясціла каментар пад загалоўкам «Яны ўзарвалі наша быццё». Артыкул вельмі характэрны, бо тут ёсць усё з вышэйпералічанага — ад маніпуляцый да ярлыкоў. Аўтар Максім Гілевіч пачынае з таго, што наўпрост называе абвінавачаных Каваляёва і Канавалава тэрарыстамі. Хоць права такое мае толькі суд. І не дай бог «Нашай Ніве» такое напісаць -- нас бы зараз жа чакала папярэджанне і штраф.

«Мы жылі ў мірнай, спакойнай, радаснай краіне. Выбух у Віцебску здаваўся нам дзіцячым свавольствам. Выбух у Мінску на Дзень незалежнасці — хуліганствам, хай і занадта жорсткім. Выбух у метро паставіў кропку», — працягвае аўтар. Спецыфічнае, прызнаюся, ўяўленне ў спадара Гілевіча пра спакой і радасць, калі паўсотні параненых у Віцебску і гэтулькі ж у Мінску падаюцца яму ўсяго толькі свавольствам і хуліганствам. Што тут казаць пра такую «дробязь», як арышт сотняў дэманстрантаў і пасадка ў турму кандыдатаў у прэзідэнты ў дзень выбараў. Хіба што гэта ўжо стала нормай для «спакойнай і радаснай краіны».

Дробяззю для аўтара аказалася і злёгку зманіць пра ўвядзенне надзвычайных мераў бяспекі на масавых мерапрыемствах. Ён сцвярджае, што «краіна стала другой, падазронай» пасля 11 красавіка. Нагадаем жа яму, што турнікеты і металашукальнікі з'явіліся ў 2008 годзе, пасля «хуліганства» каля стэлы на праспекце Пераможцаў.

Далей Максім Гілевіч параўноўвае вынікі расследавання ўзарваных у 1999 годзе жылых дамоў у Маскве і поспехі беларускіх следчых у справе 11 красавіка. Ён цытуе жанчыну, што жыве ў адбудаваным на месцы маскоўскай трагедыі доме. Яна кажа, што жыве з пачуццём невядомасці, не ведаючы, дзе рване ў наступны раз. Аўтар з гонарам кажа, што «ў Мінску спрацавалі інакш». Што паміж выбухам і першым днём суда «ўсяго пяць месяцаў». Я адзін чагосьці не разумею? А як жа афіцыйная версія пра тое, што абвінавачаныя ўжо больш за дзесяць гадоў адточвалі сваё чорнае майстэрства?

**«У 2006-м галасаваў за Мілінкевіча»**

